**УДК 94(476)”1944/1950”**

# ДА ПЫТАННЯ АБ АНТЫСАВЕЦКІМ СУПРАЦІВЕ Ў ШАРКАЎШЧЫНСКІМ РАЁНЕ ПАСЛЯ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ (1944–1950 гг.)

***Г.А. МАШНЮК***
***(Прадстаўлена: Я.У. ГЛАЗЫРЫН)***

*Разглядаецца антысавецкі супраціў у Шаркаўшчынскім раёне ў перыяд з 1944 па 1950 гг., высветліць асноўныя прычыны антысавецкага супраціву. Прааналізаваны формы антысавецкага супраціву ў Шаркаўшчынскім раёне.*

Беларускі антысавецкі супраціў гэта маладаследаваймая тэма ў беларускай гістарыяграфіі. Актуальнасць тэмы дадзенага даследавання, заключаецца ў тым, што ў сучаснай беларускай гістарычнай літаратуры няма адназначнай ацэнкі дзейнасці антысавецкага руху ў пасляваенны перыяд. Таму мэта дадзенага даследвання выявіць цэлі і прычыны антысавецкага руху.

Асноўныя прычыны антысавецкага супраціву былі наступныя. Досвед палітыкай савецкай улады ў рэлігійнай, сацыяльных і эканамічных сферах, пасляваеныя рэпрэсіі да насельніцтва, якое жыло пад нямецкай акупацыяй (1941–1944 гг.) і досвед удзелу ў украінскім, польскім і літоўскім антысавецкім супраціве. Прычынай стварэння антысавецкіх атрадаў было тое, што людзі ўцякалі ў лес ад пераследу савецкай улады, бо многія, хто сыходзіў у лес, падчас вайны маглі дабраахвотна супрацоўнічаць з акупантамі, ці пад прымусам, напрыклад, харчзагатоўкі для нацыстаў пасля вайны маглі расцэнньвацца савецкай уладай, як супрацоўніцтва з ворагам і здрада Радзіме [1, с. 89–90].

У 1943 г. становішча Германіі змянілася не лепшым чынам.Тэрыторыя Беларусі стала разглядацца як арэна партызанскай вайны супраць СССР. Нямецкае кіраўніцтва выкарыстала на сваю карысць беларускіх калабарантаў, якія марылі пра сапраўдную беларускую незалежную дзяржаву. Іх інтарэсы саўпалі: немцы ўзбройвалі беларусаў, тым самым стваралі войска, а яны такім чынам атрымалі вялікую агінтурную сетку. План па стварэнні антысавецкага руху быў разпрацаваны ў Берліне пад назвай «Любімая котка». У дакуменце ад 12 версасня 1943 г. ідзе гаворка пра тое, што з неспрыяльнай сітуацыі на фронце, патрабуецца падрыхтоўка спецыяльных каманд для доўгатэрміновай вайны [2, с. 70]. Набор кадраў ажыцяўляўся сярод мясцовых супрацоўнікаў СД і антысавецкіх груп, якія маюць досвід у партызанскай вайне. Дапускаліся асобы, якія прайшлі праверку ў СД [3, с. 62]. Такім чынам, беларускі антысавецкі супраціў быў часткова створаны за кошт дапамогі нацыстаў, якія разлічвалі аставіць ў тыле Чырвонай Арміі дыверсійна-партызанскую сетку.

Антысавецкі супраціў у Шаркаўшчынскім раёне, распачаўся ў 1944 г. Вядома, што існавалі атрады Сікоры, Ляскоўскага, Мурзіча ў другой палове 1940-х пачатку 1950-х гг., атрад Віктара Сікоры (сын вядомага селекцыянера, сябар СБМ). Адзін з бюлютэняў БНП, які выйшаў ў 1946 г. меў артыкул пра антысавецкі супраціў у Беларусі, але ў ім не было інфармацыі пра антысавецкі рух ў Шаркаўшчынскім раёне, а таксама ў Усходняй Беларусі. Гэта, напэўна, звязана з пасіўнасцю атрадаў якія былі, ці з прычыны не выхада на сувязь з заходнямі выведкамі [1, с. 95].

Паралельна аддзелу В. Сікоры арганізуецца аддзел пад камандваннем Івана Ляскоўскага на Кубелеўшчыне. Вядома, нават, колькасць ўдзельнікаў 15–20 чалавек ва ўзросце ад 15 да 20 год. У аддзел уваходзілі: Віталь Іванавіч Маляўка, Віталь Юльянавіч Маляўка з вёскі Пілаты, Алег Катовіч з в. Малінава, Іван Гушча і Віталь Гушча з в. Карчы, Генадзь Новікаў з Глыбоччыны, Васільевіч Цярпілка і Чапулёнак.

Вядомы лёс Івана Грушы. Родзіч Івана Грушы, Стэфан Груша, які быў старшынёй Бяльдзюжскага с/с. адправіў бацькоў І. Грушы ў Сібір. Атрад веў пасіўны супраціў, не рабіў нападаў на вёскі, ўдзельнікаў атраду бралі на ноч ў вёсках, дзе ў людзей былі таксама антысавецкія настроі [4].

Антысавецкія аддзелы праводзілі баявыя аперацыя па ліквідацыі прадастаўнікоў сілавых структур і ўлады. У в. Рабартава быў забіты начальнік раённага аддзелу міліцыі Судакоў, недалёка ад в. Ручай бандыты забілі сакратара райвыканкаму Трыцякова, першага старшыню Варонкаўскага сельсавета, лейтэнант з ваенкамата Ганюшкін таксама быў забіты бандытамі. Як і ў іншых заходніх раёнах БССР ад бандыў гінулі мясцовыя актывісты, якія мелі добрыя адносіны з савецкай уладай. Зімой 1945 г. У в. Таўкіні былі сапраўдным чынам растраляны ўдзельнікі груп дапамогі міліцыі, якія сабраліся ў хаце Назарава. У дом зайшлі два бандыты Загаруй і Парашкура і вывелі людзей на выліцу, дзе і растралялі, сярод забітых быў 18-ці гадовы хлопец Восіп Корсак. Пасля гэтага ўчынку Загаруй і Парашкура былі ліквідаваны. Аддзел Мурзіча з 12 чалавек праводзіў акцыі ў раёне саўгаса ім. Маркава [5, с. 384].

Існавалі выпадкі дыверсій на лніях сувязі паміж вёскамі Зямцы і Піліпы ў Шаркаўчынскім раёне восенню 1945 г. Падобная дыверсія была зроблена і ў Паплаўскім сельсавеце 1-2 лістапада 1945 г. Было

знята тры пралёты кабелю паміж вёскамі Курылавічы, Зямцы [6, с.72]. На сённяшні дзень невядома хто менавіта зрабіў дадзеныя акцыі, але сама верагодна, што гэта быў атрад І. Ляскоўскага.

З успамінаў Аляксея Танканога для барацьбы з бандытызмам у Шаркаўшчынскім раёне былі створаны групы з добраахвотнікаў колькасцю 5- 6 чалавек. У асноўнам ліквідацыя бандаў адбывалася ўначы, падчас збройных акцый гінулі супрацоўнікі міліцыі і добраахвотнікі [5, с.384].

Разгром антысавецкага руху быў поўнасцю здейснены ў 1950 г. Група Мурзіча была разбіта поўнасцю вясной 1945 г. Да гэтага бандытаў доўгі час шукалі па хутарах, але з першага разу разбіць аддзел не ўдалося, былі паранены два бандыты: брат Мурзіча і Сапеля, астатнім удалося ўцячы. Быў разбіты аддзел Ляскоўскага. Па сведчаннях Іосіфа Шудзеля, Новікаў быў засланым агентам МГБ. Падобная тактыка апісваецца ў метадычцы для спецслужбаў СССР «Белорусские буржуазные националисты», калі засылаюцца агенты ў антысавецкія атрады з ліку былых удзельнікаў, якія могуць нават засылацца і за мяжу для шпіянажу [7, с. 38]. Аднаго з удзельнікаў атраду Міхаіла не ўдалося ўзяць жывым, ён даў бой супрацоўнікам НКВД на хутары за Більдзюгамі, па некаторых дадзеных ён забіў некалькі НКВДэшнікаў. Яго сумелі параніць. Узяўшы ў палон, яго закатавалі да смерці і па чутках, ён быў пахаваны ў Шаркаўшчыне ў двары аддзела міліцыі, потым пабудавілі на тым месцы прыберальню. Астатніх удзельнікаў атрада чакаў суд, які скончыўся ў 1950 г. Усім паўналетнім далі 25 год, а Маляўка Славік і Маляўка Генадзь атрымалі 10 год. Была пакарана, нават, маці забітага Міхаіла. Але з прыходам да улады Хрушчова і палітыкай рэбелітацыі ўсе пакараныя удзельнікі атраду вярнуліся дадому ў 1956 г. Таксама савецкія ўлады разбілі аддзел В. Сікоры, сам адбыў В. Сікора ў лагерах 10 год і вярнуўся дадому ў 1954 г. І пражыў да 2008 г. [4].

Такім чынам антысавецкі супраціў ў Шаркаўшчынскім раёне пачынаецца адразу з адыхода ў ліпене 1944 г. нямецкіх Асноўнымі прычынамі антысавецкага супраціву былі: па-першае палітыка бальшавікоў у рэлігійнай, сацыяльных сферах, рэпрэсіі да насельніцтва якое жыло падчас нямецкай акупацыі (1941–1944 гг.). Асноўнымі формамі антысавецкага супраціву ў Шаркаўшчынскім раёне былі: забойствы мясцовых савецкіх актывістаў, прадстаўнікоў улады і прадстаўнікоў сілавых структур; антысавецкімі аддзеламі праводзіліся дыверсіі на лініях сувязі ў лістападзе 1945 г. Антысавецкі супраціў у Шаркаўшчынскім раёне меў сваю асаблівасць, пасіўны супраціў пастунова набывае актыўны характар, павялічваецца колькасць удзельнікаў. Антысавецкі супраціў у Шаркаўшчынскім раёне працягваўся прыкладна да 1950 г.

## ЛІТАРАТУРА

1. Загорскі, А. Пакаянне злачынствы камуністычнага рэжыму і антысавецкі супраціў / А. Загорскі. – Менск : Праект пакаянне, 2007. – 108 с.
2. Справаздача камандзіра асобай групы гаўптмана Отта Марыі Шульца камандуючыму Паліцыяй бяспекі і СД Осталанда д-ру Вальтэру Штальэкеру аб падрыхтоўцы агентаў з ліку «туземнага персаналу» ад 27 траўня 1944 г. // Беларускі рэзыстанс. – 2009. – № 2. – С. 70.
3. Загад Галоўнага упраўлення імперскай бяспекі (РСХА) у Берліне аб пачатку рэалізацыі плана «Любімая котка» на ўсей тэрыторыі «Остланда». Загад скіраваны камандаючыму Паліцэйскай бяспекі і СД Остланда д-ру Вальтэру Штальэкеру 12 верасня 1943 г. // Беларускі рэзэстанс. – 2009. – № 2. – С. 62–63.
4. Антысавецкі рух у Шаркаўшчынскім раёне пасля вайны [Электронны рэсурс]. – 2008. – Рэжым доступа: <http://westki.info/artykuly/1345/antysaviecki-ruch-u-sarkouschynskim-raionie-paslia-vayny>. – Дата доступа: 20.07.2016.
5. Памяць : гіст.-дакум. хроніка Шаркаўшчынскага раёна / уклад. Л.М. Лабачэўская ; маст. Э.Э. Жакевіч. – Мінск, 2004. – 509 с.
6. Цыбульскі, Л. Дыверсіі на лініях сувязі ў Беларусі ў лістападзе 1945 году / Л. Цыбульскі // Беларускі рэзэстанс. – 2005. – № 1. – С. 72–73.
7. Бойченко, В.М. Белорусские буржуазные националисты / В.М. Бойченко, П.П. Еремин. – М. : Редакционно-издательский отдел, 1957. – 49 с.